# Беларускі ўніверсітэт

**Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна**

№ 21 (263) | 30 чэрвеня 1956 года | Цана 20 кап.

# У ДОБРЫ ЧАС!

Пяць год назад, развітаўшыся са школай, з настаўнікамі, сённяшнія выпускнікі пераступілі парог універсітэта. Для іх пачалося новае жыццё, поўнае рознастайных уражанняў, цікавае і захапляючае. І дзе-б ты ні быў, ты ніколі не забудзеш сваіх сяброў, любімых педагогаў, назаўсёды застануцца ў памяці гарачыя спрэчкі, дыспуты у гуртках і на сходах, бяссонныя ночы і хвалюючыя мінуты перад экзаменамі, першая практыка, разам з якой прыходзіла нязменна думка: ці правільна я выбраў прафесію? Студэнцкія гады—самыя добрыя і незабыўныя ў жыцці. І вось зараз яны—выпускнікі універсітэта. Колькі разоў кожны студэнт марыў аб гэтым дні! І калі гэты дзень наступіў, нямнога сумна ад таго, што даводзіцца развітвацца з універсітэтам, з сябрамі—тут-жа прайшло пяць гадоў вучобы.

Вялікім атрадам уваходзяць зараз у жыццё краіны фізікі і гісторыкі, хімікі і філолагі, географы і юрысты, біёлагі і геолагі—учарашнія студэнты—сённяшнія выпускнікі. Многіх з іх чакае далёкі шлях: наша краіна вялікая, і ў кожным яе кутку патрэбны новыя сілы. Выпускнікі геолага-геаграфічнага факультэта Л. і Б. Бабкіны, В. Бараноўскі, Д. і В. Ярошыны, В. Будай едуць на работу ва Ўсходнюю Сібір і Казахстан. Шчаслівага шляху, добрай работы жадае ім універсітэт.

Дзе-б ні працаваў выпускнік універсітэта: у сярэдняй школе, навукова-даследчым інстытуце, у заводскай лабараторыі, у рэдакцыі або геалагічнай экспедыцыі—усюды ён будзе укладваць у работу усе свае маладыя сілы, ісці туды, дзе ён больш за усе патрэбен, а гэта значыць не словам, а справай дапамагаць роднай краіне.

Выконваючы вялікія прадвызначэнні партыі, наш народ вядзе вялікае будаўніцтва па усёй нашай неабсяжнай Радзіме: на Поўначы і Поўдні, на Крайнім Усходзе і Захадзе растуць новыя гарады, заводы, фабрыкі, узводзяцца новыя электрастанцыі, спеюць багатыя ўраджаі.

Перад вамі адкрыта шырокая дарога ў будучае. У сценах універсітэта вы атрымалі адукацыю, але гэта яшчэ не значыць, што вучоба ужо закончана. Каб ісці ў нагу з жыццём, трэба пастаянна працаваць, павышаць свае веды.

Няхай першыя цяжкасці не палохаюць вас. Без цяжкасцей-жа няма вялікіх і цікавых спраў! Радасна бачыць вынікі сваёй працы, бачыць тое, што твая праца патрэбная, карысная.

Ленін вучыў моладзь смела брацца за ўсякую неабходную для нашай Радзімы работу, не баяцца дробных і будністых спраў, бо з іх складваюцца справы вялікія.

Наша моладзь ніколі не баялася і не баіцца ніякіх цяжкасцей, заўсёды працуе па-комсамольску, з запалам і аганьком.

Радзіма чакае вас, маладыя спецыялісты!

У добры-ж час, сябры!

# Маладым спецыялістам

★

Мне хочацца павіншаваць новы атрад гісторыкаў і пажадаць яму упорна і настойліва працаваць над пашырэннем сваіх ведаў. Вялікая і ганаровая задача гісторыка. Бясконцыя прасторы і гарызонты, адчыненыя марксісцка-ленінскай гістарычнай навукай. Але бязмежна і ваша адказнасць, бо вам, гісторыкам, партыя, урад і увесь савецкі народ даручаюць ганаровую задачу: паказаць нашым дзецям і унукам вялікае мінулае і будучае нашай краіны, выхаваць у іх любоў і адданасць Радзіме, справе будаўніцтва комунізма. Вы будзеце асветнікамі маладога пакалення, і ваша праца у многім вызначыць культурнае аблічча будучых пакаленняў нашай краіны. Але вучыць іншых можна толькі тады, калі няспынна, усё жыццё вучышся сам. І аб гэтым мне хацелася-б напомніць вам яшчэ раз у час развітання з вамі.

**Прафесар Н. П. ПАЛЕЦКІ.**

★

У 1956 годзе наш універсітэт выпускае сотні спецыялістаў па грамадскіх і прыродазнаўчых навуках. Як справядліва адзначыў у канцы Айчыннай вайны тав. П. К. Панамарэнка, галоўная вартасць нашых універсітэцкіх спецыялістаў, акрамя іх высокай тэхнічнай падрыхтоўкі, іх гарачы патрыятызм—гатоўнасць аддаць усе сілы на служэнне Радзіме. Мы, старыя прафесары Беларускага універсітэта, горача жадаем, каб гэтую слаўную традыцыю з гонарам падтрымалі і студэнты, якія заканчваюць універсітэт у 1956 годзе, і выказваем цвёрдую упэўненасць, што у іх не памылімся.

**Прафесар Т. Н. ГОДНЕЎ.**



*НА ЗДЫМКУ: Група студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна, якія выказалі жаданне ехаць на уборку ураджаю на цалінныя землі Казахстана (злева направа): Галіна Іванова, Васілій Трус, Соф'я Куц, Эдуард Леановіч, Яўгенія Велеська, Валянціна Еськова, Галіна Рэутовіч, Барыс Лаўрыновіч і Яўгенія Ягела.*

*Фото Ул. КІТАСА.*

# КОМСАМОЛЬСКІ АБАВЯЗАК

Зварот Цэнтральнага Камітэта ВЛКСМ да усіх комсамольцаў, да усёй савецкай моладзі з заклікам дапамагчы навасельцам убраць багаты ураджай на цалінных і абложных землях з'явіўся для студэнтаў універсітэта вялікай і радаснай падзеяй.

Днямі многалюдны калектыў БДУ сабраўся на мітынг. З уступным словам выступіў першы сакратар гаркома комсамола Л. Г. Максімаў.

— На Усход паедзе самая перадавая моладзь, — гаворыць ён— Безумоўна, сустрэнуцца і цяжкасці. Першы час прыдзецца жыць у шалашах, зямлянках. Але гэта не спалохае нашу моладзь, якая цяжкасцей не баіцца і з гонарам падтрымае Зварот ЦК ВЛКСМ.

Беларуская моладзь у асноўным паедзе у Казахстан, у якім арганізавана пяць збожжасоўгасаў беларускіх навасельцаў. Моладзь будзе працаваць на розных работах у калгасах і соўгасах. З ліку добраахвотнікаў будуць ствараца ударныя комсамольска-маладзёжныя атрады і брыгады, узначальваць іх будуць сакратары абкомаў, гаркомаў, райкомаў, а таксама сакратары і члены камітэтаў пярвічных комсамольскіх арганізацый. Адпраўка ударных комсамольска-маладзёжных атрадаў і брыгад будзе праводзіцца эшалонамі. Кожнаму ад'язджаючаму будзе аплочан праезд у абодва канцы і выдадзены сутачныя па 15 рублёў за час знаходжання у шляху.

Для студэнтаў, якія выказалі жаданне прыняць удзел ва уборцы ураджаю на цалінных землях, устаноўлен пачатак навучальнага года з 1 кастрычніка.

Кожны выпрацаваны працадзень будзе аплочвацца па існуючых у даным калгасе нормах, але не менш 3 кілограмаў збожжа і 5 рублёў грашыма. У соўгасах і нарыхтоўчых пунктах зарплата будзе налічвацца па існуючых расцэнках, але не менш 12 рублёў у дзень.

Л. Г. Максімаў адказаў на шматлікія пытанні удзельнікаў мітынгу.

**Тысячы слаўных юнакоў і дзяўчат па закліку партыі будуюць фабрыкі і заводы, гідраэлектрастанцыі, новыя пасёлкі і гарады.**

**Хутка яшчэ адзін атрад перадавой моладзі адправіцца збіраць багаты ураджай.**

**Студэнт! А чым ты дапаможаш сваёй Радзіме?**

# КЛІЧА

На трыбуну адзін за адным пачалі падымацца студэнты. Першым выступіў студэнт II курса аддз. фізікі Э. Тачыцкі. Ён зачытаў заяву, у якой коратка выкладзена просьба групы комсамольцаў II курса паслаць іх на уборку багатага ураджаю, вырашчанага навасельцамі-цаліннікамі. Гарачымі апладысментамі віталі сабраўшыяся гэтую заяву.

Такімі-ж былі выступленні і іншых прамоўцаў-студэнтаў. Студэнт 1 курса аддз. беларускай мовы і літаратуры Цыбулька сказаў:

— Студэнты нашага курса з пачуццём вялікай радасці сустрэлі Зварот ЦК ВЛКСМ. Мы добра разумеем, як патрэбна і карысна краіне наша дапамога на уборцы ураджаю, і просім паслаць нас на работу цэлым курсам.

Студэнт I курса юрыдычнага факультэта Л. Сухаверхі таксама зачытаў заяву групы студэнтаў свайго курса, якія выказалі жаданне ехаць на уборку ураджаю.

На трыбуне сакратар парткома БДУ В. І. Старавойтаў. У сваёй прамове ён гаворыць:

— Партыйная арганізацыя, рэктарат з пачуццём глыбокага задавальнення адзначаюць актыўнасць студэнтаў. Гэта сведчыць аб тым, што моладзь заўсёды гатова падтрымаць любы заклік партыі. Абавязак кожнага комсамольца — адгукнуцца на заклік Цэнтральнага Камітэта ВЛКСМ.

Партыйная арганізацыя універсітэта упэўнена, што студэнты БДУ змогуць паказаць прыклад арганізаваных і добрасумленных адносін да працы, будуць працаваць з запалам і энергіяй так, каб партыя сказала «дзякуй».

Затым аднагалосна была прынята рэзалюцыя мітынгу.

# УНІВЕРСІТЭТ ЗАКОНЧАН НАПЕРАДЗЕ— ЛЮБІМАЯ РАБОТА

**Пройдзе яшчэ некальк дзён—і сотні юнакоў і дзяўчат з дыпломам БДУ раз'едуцца ў розныя куткі краіны.**

**У кожнага з іх свая дарога, свае планы, задумы.**



**ЭЛЬВІРА ШАРАВАРАВА:**

**—Буду працаваць у сельскай школе Любаньскага раёна. Усе свае сілы, усе свае веды аддам выхаванню дзяцей.**



**УЛАДЗІМІР КАЗУШЧЫК:**

**—Будаваць электронныя лічыльныя машыны—вось мая мара. Але перш, чым будаваць, трэба яшчэ многа, многа вучыцца.**



**МАРЫЯ ВАРЧЭНЯ:**

**—Друк—мацнейшая зброя нашай партыі ў барацьбе за пабудову комунізма. Мая запаветная мара—палымяным словам савецкага журналіста дапамагаць свайму вялікаму народу ў вырашэнні грандыёзных задач пабудовы комунізма ў нашай краіне.**

# РЭЗАЛЮЦЫЯ
## мітынгу студэнтаў і супрацоўнікаў БДУ імя В. І. ЛЕНІНА

**Абмеркаваўшы Зварот Цэнтральнага Камітэта ВЛКСМ да комсамольцаў і комсамолак, да ўсёй савецкай моладзі, мы, удзельнікі мітынгу, горача адабраем Зварот Цэнтральнага Камітэта ВЛКСМ.**

**Нашы таварышы, якія па закліку Радзімы, па загаду свайго сэрца асвойваюць цалінныя землі, вырасцілі багаты ураджай. Сотні мільёнаў пудоў добрага збожжа дадуць сёлета нашай Радзіме гэтыя краі. 350 тысяч нашых равеснікаў, пасланцоў комсамола, папрацавалі як мае быць. Усе мы добра ведаем, якія цяжкасці давялося пераадолець ім, каб вырасціць багаты ураджай. Набліжаецца гарачая пара—жніво. Задача зараз заключаецца ў тым, каб хутка і без страт сабраць ураджай з вялікай плошчы. У гэтай справе неабходна наша дапамога. Мы выказваем цвёрдую упэўненасць у тым, што комсамольцы і комсамолкі нашага універсітэта, які носіць імя вялікага Леніна, з вялікім энтузіязмам, з высокай свядомасцю свайго абавязку адгукнуцца на заклік ЦК ВЛКСМ і сваімі уласнымі рукамі, не шкадуючы сіл, дапамогуць працаўнікам цалінных зямель у іх гераічнай барацьбе за хлеб. Комсамольская арганізацыя БДУ імя Леніна рашыла паслаць на цалінныя землі атрад комсамольцаў не менш 400 чалавек.**

**Аказаць дапамогу ва ўборцы ўраджаю на палях Казахстана—наш абавязак. Выканаем яго па-комсамольску!**



Экзамен па асновах марксізма-ленінізма на I курсе філфака прымае кандыдат філасофскіх навук В. М. Сікорскі.

## Глыбей вывучаць матэматыку

Нядауна у першай групе II курса аддз. матэматыкі прайшоу экзамен па курсу звычайных дыферэнцыяльных урауненняу. У цэлым уражанне ад экзамену добрае. Група, выдзеліушы на падрыхтоуку звыш 10 дзён, змагла добра падрыхтавацца, вынікам чаго з'явіліся высокія ацэнкі: 16 «выдатна» і 9 «добра» з 28. Хочацца адзначыць асабліва удалыя адказы студэнтау Мірыцкага, Чэркаса і некаторых іншых. Найбольш змястоуным быу адказ студэнта Рыукіна, які прыцягнуу значны пазапраграмны матэрыял і паказау свабоднае валоданне прадметам.

У той-жа час экзамен паказау, што нават лепшыя студэнты яшчэ не пераадолелі уласцівага вялікай колькасці матэматыкау шкалярскага падыходу да вучобы. Вывучаючы канспект і адпаведныя месцы з падручнікау і нядрэнна валодаючы неабходным мінімумам ведау, студэнты не прыцягваюць дадатковага матэрыялу, не могуць адказаць на больш складаныя, нестандартныя пытанні, якія патрабуюць навыкау самастойнага мышлення і свабоднага валодання матэматычным аналізам. Слаба адказвалі студэнты Варвашэня, Афінагенау, Цішкевіч. Зусім не засвоілі курс студэнты Басякоу і Прановіч.

Сесія закончана, уперадзе яшчэ тры гады навучання у сценах БДУ. Тым, хто нядбайна адносіуся да вучобы, трэба прыкласці усе сілы, каб выправіць дапушчаныя памылкі.

**Прафесар А. Д. МЫШКІС.**

## АБ ЧЫМ ГАВОРЫЦЬ АДЗІН ЭКЗАМЕН

У першакурснікау хімфака і геафака прайшлі экзамены па вышэйшай матэматыцы. Што-ж яны паказалі? Большая частка студэнтау глыбока засвоіла тэарэтычны матэрыял, вынікі тэорыі свабодна прымяняюцца пры рашэнні задач па хіміі, фізіцы, матэматыцы. Але ёсць і такія, якія слаба адказваюць на пытанні па курсу сярэдняй школы. У ліку іх—нават медалісты. І вось гэтыя былыя медалісты па свайму развіццю, па ведах адстаюць ад астатніх, сярэдніх студэнтау курса.

Вось адказвае студэнтка 1 курса хімічнага факультэта З. Грышчук. Яна не ведае нават простых алгебраічных дзеянняу, не можа рашаць сістэмы двух урауненняу з двума невядомымі, не мае паняцця аб трыганаметрычных функцыях. Вельмі слаба падрыхтаваны студэнты гэтага-ж факультэта А. Васілец, Р. Кобяк і іншыя.

Узнікае пытанне, як такія таварышы атрымалі атэстат сталасці, а некаторыя з іх нават і медалі. Яшчэ больш дзіуна, як яны паступілі ва універсітэт?

**А. МАКСІМЕНКАЎ,**
**старшы выкладык.**

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# РАШУЧА ПАВЫШАЦЬ ВУЧЭБНУЮ І ПАЛІТЫКА-ВЫХАВАЎЧУЮ РАБОТУ

Нядауна адбыуся партыйны сход універсітэта. З дакладам аб выніках 1955/56 навучальнага года і аб падрыхтоуцы да новага навучальнага года выступіу рэктар універсітэта прафесар К. І. Лукашоу.

Дакладчык адзначыу, што партыйны камітэт, партарганізацыі факультэтау і кафедры універсітэта дабіліся некаторых поспехау у справе паляпшэння вучэбна-выхавучай і навуковай работы у святле гістарычных рашэнняу XX з'езду КПСС.

У гэтым годзе вучэбная работа ва універсітэце праводзілася у адпаведнасці з новымі вучэбнымі планамі, якія побач з расшырэннем профіляу спецыялізацыі прадугледжваюць паляпшэнне падрыхтоукі кадрау для работы у розных галінах народнай гаспадаркі і культуры. Калектыу універсітэта удзяляу увагу паляпшэнню арганізацыі вучэбнай, выхавучай і навуковай работы, павышэнню ўзроуню лекцыйных і практычных заняткау, умацаванню сувязі кафедр з прамысловымі прадпрыемствамі і калгасамі. Навуковыя работнікі універсітэта больш шырока прыцягваліся да распрацоукі важных навуковых праблем, якія маюць вялікае тэарэтычнае і практычнае значэнне.

Аднак, як указау дакладчык, у бягучым навучальным годзе у вучэбна-выхавучай і навукова-даследчай рабоце меуся рад сур'ёзных недахопау. Многія навуковыя работнікі несвоечасова выконваюць планы навукова-даследчай работы; па-ранейшаму удзяляюць мала увагі пытанням выхавучай работы. Палітыка-выхавучая работа сярод студэнтау яшчэ не дасягнула узроуню, які патрабуецца рашэннямі XX з'езду КПСС. Маюцца выпадкі парушэння з боку асобных студэнтау вучэбнай дысцыпліны і правіл соцыялістычнай маралі.

Усё гэта—вынік адсутнасці неабходнага кантролю рэктарата і партыйнага камітэта за дзейнасцю дэканатау, кафедр і грамадскіх арганізацый універсітэта. Дэканаты, кафедры, партыйныя, комсамольскія і профсаюзныя арганізацыі факультэтау па-ранейшаму удзяляюць мала увагі пытанням выхавучай работы у акадэмічных групах. Камітэт комсамола і комсамольскія арганізацыі універсітэта не занялі вядучага месца у арганізацыі палітыка-выхавучай работы сярод студэнцтва, а профсаюзныя арганізацыі, па сутнасці, ухіліліся ад гэтага важнага участка работы.

Выступіушыя у спрэчках комуністы падверглі рэзкай крытыцы рэктарат, партком, партыйныя і іншыя грамадскія арганізацыі за недастатковы кантроль і кіраунііцтва вучэбна-выхавучай і навукова-даследчай работай.

— Рашэнні XX з'езду КПСС,— гаворыць тав. Рудзіцкі,—абавязваюць калектыу універсітэта сканцэнтраваць сваю увагу на якасці падрыхтоукі спецыялістау. Гэтым пытаннем, акрамя агульных размоу, мы яшчэ канкрэтна не заняліся. І на сённяшні дзень у студэнтау юрфака няма практыкі у выканкомах мясцовых Советау. Нават пасля з'езду партыі студэнты-юрысты не накіроуваліся на практыку у гэтыя органы. Наспела неабходнасць стварыць на юрыдычным факультэце аддзяленне совецкага будауніцтва.

Пытанню аб пісьменнасці нашых студэнтау і якасці іх дыпломных работ прысвяціу сваё выступленне тав. Абецэдарскі. Ён указау на неабходнасць пачынаць падрыхтоуку да напісання дыпломных работ з III курса. Тады у студэнтау будзе дастаткова часу для збору матэрыялу і напісання работ. Нельга мірыцца і з тым, што многія студэнты маюць нізкую пісьменнасць, аб чым сведчыць аналіз тых-жа дыпломных работ. Каб пакончыць з гэтай ганебнай з'явай, неабходна хаця-б некалькі разоу на працягу пяці год даваць студэнтам дыктанты. Гэта прымусіць іх сістэматычна працаваць над павышэннем сваёй пісьменнасці.

Аб гэтым-жа гаварыу у сваім выступленні і тав. Бабіцкі.

— У мінулым годзе,—гаворыць ён,—на юрфаку на адно месца было пяць заяу. Спачатку я узрадавауся: ёсць магчымасць укамплектаваць факультэт пісьменнымі студэнтамі. Але радасць гэта была заучаснай: курсавыя работы студэнтау I курса аказаліся зусім непісьменнымі. Паустае пытанне, няужо з пяці чалавек не знайшлося хаця-б аднаго пісьменнага? А тлумачыцца гэта тым, што ва універсітэт трапляе многа па-за конкурсам. Такую практыку пара зжыць. Неабходна таксама спытаць работнікау Міністэрства асветы: чаму школы выдаюць атэстаты сталасці недастаткова пісьменным людзям?

Тав. Бабіцкі асудзіу парочную практыку, калі пры складанні раскладу не улічваюцца думкі выкладчыкау і інтарэсы студэнтау, у выніку чаго у адзін дзень студэнты часта рыхтуюцца да двух семінарскіх заняткау. Ён спыніуся на пытанні аб новым палажэнні у адносінах нагрузкі выкладчыкау. Новае палажэнне, гаворыць тав. Бабіцкі, прадастауляе рэктарату вялікія правы. Гэта дае магчымасць стварыць спрыяльныя умовы для росту сярэдняга звяна навуковых работнікау.

— Ва універсітэце склаліся вельмі устойлівыя формы лібералізма,—сказау у сваім выступленні тав. Фактаровіч.—У нас амаль зусім знікла ацэнка «здавальняюча». І не дзіуна, што многія студэнты ад бяздзелля не ведаюць, чым заняцца. Клуб «Далоу сум» узнік сярод гультаёу і бяздзельнікау. Каб прымусіць. студэнтау займацца карыснай працай, неабходна прад'явіць сур'ёзныя патрабаванні як пры прыёме ва універсітэт, так і у ходзе самой вучобы. Калі-ж студэнт не працуе, яго трэба выключыць з навучальнай установы.

Аб рабоце выдавецтва універсітэта гаварыу у сваім выступленні тав. Волк. Ён падверг рэзкай крытыцы практыку складання выдавецкіх планау, падкрэсліу, што запланаваныя работы у тэрмін не прадстауляюцца у выдавецтва.

Сакратар партыйнага камітэта тав. Старавойтау звярнуу увагу партыйнага сходу на адсутнасць належнай актыунасці сярод комуністау, на пасіуны удзел многіх з іх у рабоце партыйных сходау. Гэта сведчыць аб тым, што некаторыя таварышы закрываюць вочы на нашы недахопы, не ускрываюць іх, не падказваюць шляхоу да іх выпраулення. Слабая актыунасць комуністау гаворыць аб слабасці усёй нашай палітыка-выхавучай работы. Аб тым, што з палітыка-выхавучай работай у нас не усё добра, гаворыць усім вядомы фельетон, змешчаны у нашай газеце, які ускрывае факты грубага парушэння з боку асобных студэнтау патрабаванняу соцыялістычнай маралі, сведчыць аб дрэнным стане нашай палітыка-выхавучай работы. Абавязак кожнага з нас— прымаць актыуны удзел у жыцці нашай партыйнай арганізацыі, рашуча ускрываць недахопы і указваць шляхі да іх ухілення.

Комуністы тт. Павецьеу, Саладкоу, Бабкоу указалі на недахопы у вучэбна-выхавучай і навукова-даследчай рабоце. Тав. Бабкоу падверг рэзкай крытыцы работу профсаюзных арганізацый універсітэта.

У прынятым рашэнні партыйны сход намеціу рад канкрэтных мерапрыемствау, накіраваных на ліквідацыю недахопау і рашучае паляпшэнне вучэбна-выхавучай работы у новым навучальным годзе.

**П. СІЛІВАНЧЫК.**

## ПІСЬМЫ З ПРАКТЫКІ

★ ★ ★

### *У рэдакцыях газет*

Вучэбная практыка — гэта першая самастойная работа, а таму зразумела тое хвляванне і нецярпенне, з якім студэнты чакалі сваёй першай практыкі. Асноуная большасць студэнтау праходзіць практыку у раённых газетах рэспублікі. Некалькі чалавек паехала за межы Беларусі: у Одэсу, Кішынёу, Смаленск і нават на Далёкі Усход.

У пісьмах студэнты расказваюць аб сваіх уражаннях, аб першых цяжкасцях, няудачах і радасцях. Колькі новага і цікавага давялося ім сустрэць!

У слуцкай раённай газеце «За соцыялістычную Радзіму» праходзяць практыку В. Скапа, І. Шамрэева, В. Цішкевіч.

І. Шамрэева расказвае: «Я працую у аддзеле прамысловасці. Мне часта даводзіцца бываць на многіх прадпрыемствах, сустракацца з людзьмі розных прафесіі. Тут, у раённай газеце, мы знаёмімся з апаратам рэдакцыі, з арганізацыяй работы розных аддзелау. Калектыу рэдакцыі слуцкай газеты задаволен работай В. Скапы. Ён добрасумленна адносіцца да тых заданняу, якія яму даручаюць».

У Скідзелі, у газеце «Красное знамя», працуюць Л. Кладніцкая і А. Лазоуская. Яны пішуць: «Часта мы выязджаем у калгасы, збіраем патрэбныя матэрыялы, арганізоуваем выступленні перадавых рабочых і калгаснікау».

Іменна зараз, на практыцы, другакурснікі пераканаліся у правільнасці выбранай прафесіі і у тым, як паважаюць і любяць у нас газету.

**В. ПРЫБАВА,**
**Н. КАВАЛЁВА.**

### Першае знаёмства з работай суда

Для павышэння тэарэтычных і практычных ведау студэнтам II курса юрыдычнага факультэта трэба прайсці вытворча-пазнавальную практыку у судзе і пракуратуры. У ходзе практыкі мы павінны грунтоуна азнаёміцца з работай гэтых органау. Хаця практыка пазнавальная і мы самі нічога не выконваем, а толькі сочым за работай пракурорскіх і судовых работнікау, усё-ж яна мае для нас вялікае значэнне. Асабліва цікавай была практыка у пракуратуры Варашылаускага раёна. І гэта упауне зразумела, бо работа следчых самая цікавая і рознастайная, але у той-жа час і самая цяжкая. Трэба аддаць належнае следчым Трафімаву, Рэмізевіч, Шапараву, якія ахвотна стараліся растлумачыць нам усё незразумелае, дапамагчы разабрацца у складаных пытаннях жыцця. З імі мы выязджалі на вобыск, на месцы здарэнняу, прысутнічалі пры допыце абвінавачваемых і сведак. У сучасны момант мы праходзім практыку у судзе Варашылаускага раёна. Тут мы знаёмімся з работай канцылярыі, прысутнічаем на працэсах і на прыёмах у суддзі.

**ДЗЕМІДОВІЧ,**
**КАРПОВІЧ,**
**РУДОЛЬ,**
**студэнты II курса юрыдычнага факультэта.**

## Экзамены і залікі па зарубежнай літаратуры

Нядауна закончыліся экзамены і залікі на I і II курсах філалагічнага факультэта і на II курсе гістарычнага факультэта.

Добра, у асноуным, здавалі залік па зарубежнай літаратуры XIX в. студэнты трох груп II курса беларускага аддз. Вельмі добра адказвалі студэнты Максімовіч, Лук'янцава, Матусевіч і інш.

Упершыню за апошнія гады на II курсе (аддз. рускай мовы і літаратуры, акрамя экзамену па зарубежнай літаратуры XIX в., быу уведзен залік па гэтаму курсу. Выдатна адказвалі студэнты Дзянісава, Лушчыцкая, Клімау, Карповіч, Левіна, Шалаева, Патаповіч, Мішурная, Вяроукіна, Лебедзева і іншыя. Аднак не усе следавалі іх прыкладу. Студэнты Кароткая, Радзіонау і Кахановіч атрымалі нездавальняючыя адзнакі.

На II курсе гістарычнага факультэта быу праведзен залік па спецкурсу «Гістарычны раман у зарубежнай літаратуры». Усе студэнты II курса гістарычнага факультэта паспяхова здалі гэты залік.

**Н. І. ЛАПІДУС,**
**кандыдат філалагічных навук.**

### *Абарона дысертацыі*

**На апошнім пасяджэнні Вучонага совета Н. Хрыпко абараняла дысертацыю на тэму «Дзейнасць КПСС па падбору, расстаноуцы і выхаванню навуковых кадрау у чацвертай пяцігодцы». Работа атрымала высокую ацэнку. Н. Хрыпко прысуджана ступень кандыдата гістарычных навук.**



Перад апошнім экзаменам. ФОТО І. Кірэнка.

# ПА ЮГАСЛАВІІ

У сталіцу Югаславіі—Белград мы прыбылі 17 мая. Хаця тэрмін знаходжання у Югаславіі быу невялікі, але югаслауское таварыства «Путнік» добра арганізавала работу, і мы убачылі многа цікавага, пазнаёміліся з грамадскім ладам і бытам працоуных Югаславіі.

За 15 дзён мы праехалі па самых прыгожых месцах і спыняліся у гарадах, якія маюць вялікае гістарычнае мінулае у вызваленчай вайне югаслаускага народа супраць турэцкага ярма і фашысцкага нашэсця.



Мы пабывалі у адміністратыуным цэнтры Босніі і Герцагавіны—у горадзе Сараева, заснаваным яшчэ у XIII в. Агледзелі яго гістарычныя помнікі: саборы, мячэці, музеі. Пабывалі у 16 кілометрах ад Сараева ля вытока Босна, які вялікай падземнай ракой выходзіць з падножжа гары. Агледзелі наваколле горада. Асабліва прыгожы горад, калі глядзець на яго з вяршынь, якія акружаюць Сараева з трох бакоу і нібы прыціскаюць яго да гэтых гор. Мясцовыя жыхары, даведаушыся, што мы савецкія грамадзяне, вельмі ветліва сустракалі нас, запрашалі у свае кватэры, знаёмілі з жыццём.

На пяты дзень, пераваліушы горныя хрыбты, мы спусціліся да пабярэжжа Адрыятычнага мора і спыніліся на тры дні у горадзе Дуброунікі. Гэты горад цяперашняй Харватыі пачау будавацца у VII в. Цяпер гэта прыгожы партовы і курортны гарадок, акружаны старадауняй сцяной, якая мае таушчыню да чатырох метрау.

З г. Дуброунікі мы зрабілі экскурсію аутобусам за 150 кілометрау у горад Цэцінье—былую сталіцу Чорнагорыі. Каб дабрацца да Цэцінье, неабходна было перадолець горны хрыбет вышынёй каля 1700 метрау. Месца выключна маляунічае: на хрыбце снег, а у даліне на дрэвах спелыя чырвоныя чарэшні.

Праз тры дні мы ужо у Спліце—вялікім партовым, прамысловым і курортным горадзе. Вечарамі каля нашай гасцініцы збіралася мясцовае насельніцтва. У дружалюбнай гутарцы яны нас знаёмілі з палітычнай і грамадскай будовай Югаславіі, з работай і кіраваннем на фабрыках і заводах, з навучальнымі установамі.

Наступны пункт нашага прыпынку знаходзіуся за 305 кілометрау ад Спліта—на азёрах і вадаспадах Плітвіца. Гэта найпрыгажэйшы куток Югаславіі. Ужо у чатыры гадзіны раніцы мы не спалі, а праз некалькі мінут накіраваліся аглядаць горныя азёры і каскады вадаспадау. Некаторыя вадаспады дасягаюць вышыні да 70 метрау.

У Загрэбе мы пазнаёміліся з помнікамі старажытнасці. Пабывалі у музеях, саборах, парках, а вечарам гутарылі ва універсітэце са студэнтамі. Яны падаравалі нам некалькі нумароу сваёй студэнцкай газеты.



І вось мы зноу заканчваем свой шлях Белградам. У Белградзе наведалі станкабудаунічы завод. Пасля агляду завода галоуны інжынер і дырэктар адказвалі на цікавячыя нас пытанні. У прыватнасці, дырэктар заявіу, што высокакваліфікаваныя спецыялісты для завода рыхтуюцца праз універсітэт, але стыпендыю студэнтам (25 чалавекам) выплачвае завод. Выпускаемыя станкі завод рэалізуе як унутры краіны, так і за граніцай.

Дырэктар і галоуны інжынер не прызначаюцца, а зацвярджаюцца рабочым советам па конкурсу.

Вечарам невялікай групай мы накіраваліся ва універсітэт на прыродаматэматычны факультэт. Нас добра прынялі выкладчыкі кафедры фізікі Мішковіч, Міхайлау і іншыя. Мы цікавіліся перш за усё праграмай, спецыялізацыяй і лабараторыямі факультэта. У ходзе гутаркі нам расказалі, што ва універсітэт паступаюць з дванаццацігадовай адукацыяй. Навучаюцца пяць год і у залежнасці ад жадання могуць спецыялізавацца па матэматыцы, фізіцы, астраноміі, хіміі і геафізіцы. Новым для нас з'явілася тое, што пасля здачы дзяржэкзаменау і дыпломных работ студэнты не атрымліваюць дыплома. Яны атрымліваюць яго толькі пасля двух—трох год работы на вытворчасці або у школе. У залежнасці ад таго, як пакажа сябе выпускнік, а не па дыплому, вызначаецца у далейшым яго зарплата.

У час вучобы студэнтам выдаецца стыпендыя, роуная прыкладна поумесячнай зарплаце рабочага. Але стыпендыя выплачваецца не дзяржавай, а прадпрыемствамі або установамі, якім патрэбны спецыялісты і з якімі студэнты маюць дагаворы.

Затым мы агледзелі лабараторыі і бібліятэку факультэта. Фізічныя кабінеты прасторныя, абсталяванне іх знаходзіцца у належным парадку. Схемы і праграмы лабараторных работ зроблены вельмі акуратна. Многія прыборы вырабляюцца у лабараторыях і майстэрнях універсітэта. Прауда, адчуваецца недахоп у складаным навейшым фізічным і геафізічным абсталяванні, а таксама у фізічнай літаратуры. Нашы югаслаўскія калегі па прафесіі выказалі пажаданне аб абмене перыядычнай літаратурай паміж Белградскім і Беларускім універсітэтамі.

Дружалюбны югаслаускі народ—працавіты і не хоча вайны. Мы бачылі новабудоулі фабрык і заводау, аутамабільных і чыгуначных магістралей, бальніц, клубау, жылых дамоу і магазінау. На будоўлях вельмі шырока выкарыстоуваецца жалезабетон, нават слупы ліній электраперадач або слупы агарожы робяцца з бетону і жалезабетону. Гэта падзешауляе будоулю і павялічвае доугавечнасць збудавання.

Наша турысцкая група засталася вельмі задаволенай як маршрутам падарожжа, так і ветлівасцю, якая аказана нам югаслаўскім народам на усім шляху нашага следавання.

**С. А. ПАХУТА,**
**дацэнт БГУ.**

**НА ЗДЫМКАХ:**
**1. Агульны выгляд гор. Дуброунікі. 2. Крэпасць у ваколіцах г. Дуброунікі.**

# У ГУРТКУ ФІЛАСОФІІ

У прайшоушым навучальным годзе, як і на працягу раду папярэдніх год, у сістэме партыйнай асветы універсітэта працавау філасофскі семінар навуковых работнікау пад кірауніцтвам дацэнта В. І. Сцяпанава. Семінар аб'ядноувае вялікую групу высокакваліфікаваных навуковых работнікау фізіка-матэматычнага, хімічнага і біялагічнага факультэтау. Тут вывучаюцца навейшыя праблемы філасофіі, прыродазнауства, якія цікавяць удзельнікау семінара і садзейнічаюць, як аб гэтым заяуляюць самі удзельнікі семінара, іх непасрэднай навуковай і педагагічнай рабоце.

У прайшоушым годзе на семінары вывучалася праблема барацьбы з ідэалізмам у сучасным прыродазнаустве. Глыбокія даклады спецыялістау адпаведных галін ведау (Старобінца і Баркана па хіміі, Лукомскай па матэматыцы і інш.), затым ажыуленая дыскусія удзельнікау семінара і, нарэшце, змястоунае і вычарпальнае заключае слова кіраунікa семінара дацэнта В. І. Сцяпанава, у якім поунасцю выяуляюцца спрэчныя і незразумелыя пытанні абмяркоуваемай тэмы,—такі выпрабаваны метад работы семінара. Семінар, несумненна, садзейнічае павышэнню агульнага узроуню развіцця і марксісцка-ленінскай падрыхтоукі яго удзельнікау. Так, напрыклад, матэматыкі з цікавасцю даведваюцца аб сучасных праблемах біялогіі і хіміі і іх правільнай трактоуцы з пункту гледжання філасофіі дыялектычнага матэрыялізма.

Рабоце семінара у мінулым навучальным годзе перашкаджалі некаторыя арганізацыйныя непаладкі. Так, напрыклад, на біялагічным факультэце двойчы назначаліся заняткі навуковага біялагічнага семінара якраз у час работы філасофскага семінара. Адны заняткі семінара сарваліся з-за унечарговага пасяджэння Вучонага совета. Партыйны камітэт павінен дабіцца таго, каб ніякая іншая работа не перашкаджала заняткам гурткоу партыйнай асветы.

**А. Х. ТУРЭЦКІ,**
**дацэнт, стараста гуртка.**

# Новыя выданні

У выдавецтве БДУ выйшлі у свет наступныя кнігі:

1. **Вінберг Г. Г.,** Інтэнсіунасць абмену харчовых патрэб рыб.
2. **Лукашоу К. І.,** Асноуныя генетычныя тыпы чацвярцічных адкладанняу СССР.
3. **Сікорскі В. М.,** Марксісцкі філасофскі матэрыялізм.
4. Вучоныя запіскі, выпуск XXVII, серыя філалагічная.

Змест: **Гутарау І. В.,** Аб дзесятым раздзеле «Еугенія Онегіна» А. С. Пушкіна; **Паіна Р. Б.,** Рэдакцыі сатыр А. Д. Кантэміра; **Багалюбава Н. Н.,** Гістарычная проза 20-х гадоу аб сялянскім паустанні і раман А. Чапыгіна «Разін Сцепан»; **Казлова О. В.,** Аб некаторых мастацка-стылёвых і моуных асаблівасцях палескіх аповесцяу Я. Коласа; **Шакун Л. М.,** Аб ужыванні поуных і кароткіх форм прыметнікау у складзе выказнікау у сучаснай беларускай мове; **Карабан С. І.,** Творчасць Я. Купалы у славянскай крытыцы; **Фактаровіч Д. Е.,** Да творчай гісторыі рамана Сервантэса «Дон Кіхот»; **Цімафеева В. М.,** Поспехі літаратуры еурапейскіх краін народнай дэмакратыі (вобраз станоучага героя); **Міцкевіч Б. П.,** Французская літаратура у беларускіх выданнях і перакладах; **Лапідус Н. І.,** М. Багдановіч і Т. Шэучэнка; **Крыучык В. Ф.,** Аб слоунікавым складзе беларускіх перакладных аповесцяу другой паловы XVI века; **Касоускі Б. І.,** Да пытання аб тыпах суфіксальнага словаутварэння назоунікау у мове беларускай народнасці.

# *Па слядах нашых выступленняў*

**У № 19 нашай газеты быў змешчан матэрыял «Заглянiце ў інтэрнат», у якім паведамлялася аб недастойных паводзінах дзяжурнага тав. Артышука.**

**Сакратар камітэта комсамола тав. Бабосаў паведаміў у рэдакцыю, што матэрыял «Заглянiце ў інтэрнат» абмяркоўваўся на пасяджэнні камітэта комсамола, на якім пастанавілі паставіць перад адміністрацыяй універсітэта пытанне аб зняцці з работы вахцёра інтэрната тав. Артышука.**

* * *

**Фельетон «Запіскі аб адным «клубе» быў змешчан ў № 19 нашай газеты. У ім выкладаліся факты амаральных паводзін групы студэнтаў V курса гістфака.**

**Сакратар камітэта комсамола тав. Бабосаў паведаміў рэдакцыі, што гэты фельетон абмяркоўваўся на пасяджэнні камітэта комсамола, на якім пастанавілі комсамолак М. Стоцкую, В. Кар'янаву, В. Ватковіч выключыць з радоў ВЛКСМ.**

**Студэнтам Т. Аўраменка, В. Скарабагатаву аб'яўлена строгая вымова з занясеннем ва ўчотную картку.**

**Рэдактар А. ВОЛІК.**


ТОВАРИЩИ СТУДЕНТЫ! РЕДАКЦИЯ ГАЗЕТЫ „ЗНАМЯ ЮНОСТИ“ И МИНСКИЙ ГОРКОМ КОМСОМОЛА ПРИГЛАШАЮТ ВАС НА

СТУДЕНЧЕСКИЙ БАЛ

5 июля ровно в 6

Встречи со знатными людьми
КЕМ БЫТЬ?

Доклад без докладчика
И КЕМ НЕ БЫТЬ?

Ровно в 6 5 июля

КОНЦЕРТ

*10 отделений* *9 антрактов*

В КИНОКОНЦЕРТНОМ ЗАЛЕ:
„Путешествие по Советскому Союзу“
Счастливая лотерея
Встречи с белорусскими композиторами

Для вас широко открыты двери Дворца культуры профсоюзов

*После славного труда веселиться не беда!*

Сатирические газеты у нас в гостях



Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, пакой 62, тэл. 2-07-19

АТ 074501 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 758. Тыраж 2000